■ Бабуліна навука

# БУЛЬБЯНЫ РЫТУАЛ

КОЛЬКІ сябе помніць з дзяцінства Дарынка, дык усе тыя ўспаміны цесна звязаны з бульбай. Яе вырошчванне ў сям'і, захаванне да новага ўраджаю было цэлым рытуалам, які перадаваўся з роду ў род.

Вось яна сядзіць на возе каля хлява разам з суседам па вуліцы Мікалаем Смолякам. Яна — бо малая (мусіць гадкоў з чатыры), а сусед — бо без нагі. А яшчэ таму, што ён гаспадар шэрай у яблыках кабылы. Дарынчына сям'я, дзе яна самая малодшая, уся працуе. Бацька ходка ідзе за плугам, які цягне "яблычная" кабыла. За імі ледзь паспяваюць маці разам са старэйшымі сястрой і двума братамі. Сцяпан з Мацвеем уграбаюць гной, а маці з Анютай, з каробкамі за плячыма, ходзяць па баразне ўслед за хлопцамі і кідаюць бульбіны. Сямейка садзіць бульбу на агародзе пры хаце. Шурка — меншы з братоў, але старэйшы за Дарынку на два гады, насыпае з мяхоў у лазовыя кошыкі бульбу, якую маці з сястрой раз за разам апустошваюць у свае каробкі. Потым, у іншыя дні, прыхваткамі і ўрыўкамі бульба садзіцца на латках за межамі агарода. Яны амаль усе прылягаюць да чыгункі, бо бацька Дарынкі на ёй працуе.

Дзесьці мо праз тыдзень-другі бацька зноў бярэ ў суседа кабылу і барануе бульбяныя латкі. Гэта каб зямля была рыхлай і давала дыхаць бульбе і каб праталышыць-пазбіваць пустазелле. Праз колькі часу бульба ўсходзіць, а разам з ёю і гусценная шчотка пустой непатрэбнай зеляніны. Дарынка зноў сядзіць на нейкім латунні, але ўжо на зямлі пад яблыняй і гуляе «ў лялькі». А маці з сястрой ратуюць ад пустазелля бульбу і тут жа яе агортваюць зямлёй. Ім дапамагае Шурка — ён не саромеецца «бабскай работы». Мацвей са Сцяпанам у гэты час штосьці робяць па заданні бацькі «мужчынскае».

БУЛЬБА ўсё лета расце, цвіце («буяе», так кажа маці), а потым яе бадылле ўсыхае. Гэта значыць, што бульба ўжо вырасла — паспела. Надыходзіць пара яе выкопваць. Гэта звычайна адбываецца перад школай — у канцы жніўня і першай палове верасня. Да гэтага часу да іх прыязджае баба Ганна. Яна жыве ў сына Яна, які даводзіцца Дарынцы родным дзядзькам, а яе маці малодшым братам.

**Анюта адбірае гладзенькія бульбіны на пячонікі. Калі яны прыгатаваліся, баба Ганна прымушае капальнікаў пагрэць рукі аб гарачую бульбу — каб не мерзлі зімой.**

Копка пачынаецца ў суботу. Папершае, бацька выхадны (адносна), па-другое, як кажа баба Ганна, у гэты дзень яны такім чынам ушануюць сваіх памерлых продкаў-родзічаў. Некаторых з тых «продкаў» Дарынка ведае па аповедах сваіх бацькоў і па старых фотакартках. Напрыклад, дзеда Прохара, мужа бабы Ганны, якога ні яна, ні яе сястра з братамі ніколі не бачылі — ён загінуў на вайне. А яшчэ дзеда Івана з бабай Юлькай — бацькоў яе татуся. Тыя памерлі сваёй смерцю пасля вайны. Нагараваліся і ў вайну, і пасля яе.

Працэсам кіруе бабуля, а маці Дарынкі прыслухваецца, прыглядаецца, хоць і ведае ўсе гэтыя прамудрасці з маленства. Баба Ганна наказвае капальнікам пакідаць трохі бульбы ў зямлі — каб задобрыць бульбянога бога Анчутку-бульбяніка. Каб жа Дарынцы дазволілі капаць бульбу, дык яе пра гэта не патрэбна было нават прасіць: яна гатова пакінуць для таго невядомага Анчуткі, які ўяўляецца ёй маленькім сівым дзядком з шырокай барадой і вялізнымі вусамі, усю бульбу, абы ён не галадаў. Асабліва ўзімку.

Пасля выкопвання-збірання хлопцы ладуюць-раскладваюць у канцы агарода вогнішча, а Анюта адбірае гладзенькія бульбіны на пячонікі. Калі яны прыгатаваліся, баба Ганна прымушае капальнікаў пагрэць рукі аб гарачую бульбу — каб не мерзлі зімой. Гэтая працэдура вельмі падабаецца Дарынцы. Пасля грэння рук ужо можна есці-смакаваць печаную бульбу. На свежым паветры гэта такое смакоцце, якое адбіваецца ў памяці назаўсёды.

БАБА Ганна кіруе і працэдурай закладвання бульбы на зіму: у сцёбку-склеп, у капец, у хатні падпол. Дзень выбірае адзін-адзіны — той, калі памерла яе маці (панядзелак або серада). «Каб спрыяла з таго свету», — кажа, асяняючы сябе крыжам перад пачаткам абраду.

А вось закладванне капца пачынаецца задоўга да гэтага дня з паведамлення бацькі, што «заўтра зранку пасля гомельскага цягніка пройдзе вяртушка з баластам». Пасля такой навіны ад маці паступае наказ меншым сынам:

— Хлопцы, чулі, што сказаў бацька? Пасля школы — бягом да пуці. Мне патрэбны яшчэ камяньцы на кружкі для дзежак (у сцёбку з саленнямі і мачэннямі з агуркоў, капусты і яблыкаў). Не забудзьце пра капец. Хлопцы згодна ківаюць галовамі — пачулі, зразумелі.

Назаўтра Шурка з Мацвеем пасля школы бежкі кідаюць сумкі з кніжкамі, хутка абедаюць і, пераапрануўшыся ў будзённае, агародам бягуць на чыгунку. Спяшаюцца ведама чаго: аднасельцы, што жывуць уздоўж чыгуначнай каляі, першымі пасля праходу вяртушкі з баластам аказваюцца на адхонах, бо і ў іх жа ёсць патрэба ў гладкіх камянях. Аблазіўшы адхоны насыпу, падсыпанага свежым баластам, хлопцы знаходзяць гладзенькія, нібы адпаліраваныя, камяньцы рознага калібру: адны з іх пасля мыцця кладуцца на кружкі дзежак з тымі саленнямі і мачэннямі, а невялічкія, з бульбяны клубень, — у капец.

**Бабуля наказвае пакідаць трохі бульбы ў зямлі — каб задобрыць бульбянога бога Анчутку-бульбяніка.**

— Мышкі, мышкі, тачыце-вастрыце зубкі не бульбачкай, а гэтымі каменьчыкамі, — прыгаворвае баба Ганна, а следам за ёю Дарынчына маці ў той дзень, калі закладваецца на зіму капец. Ён капаецца не вельмі глыбокім (на штык рыдлёўкі), але даволі шырокім. Тут свая навука — па вясне бульбу не дастане грунтавая вада.

Для мышэй прызначаецца і балотная асака, якой укрываюць капец. Сакрэт тут таксама просты: у адрозненне ад саломы, асабліва свежай, сяліцца ў ёй мышы не любяць (у асацэ няма зерня). А гэта значыць, што бульба ў капцы застанецца да вясны цэлай і не пашкоджанай. Потым бацька з самага верху капца ўстанаўлівае «бульбяную дыхалку» — бяростаvы скрутак у выглядзе трубы. Праз трубу-душнік бульба павінна дыхаць. Пасля ўсёй гэтай падрыхтоўкі хлопцы бяруцца за рыдлёўкі і закідваюць капец зямлёй. Бацечка Дарынкі завяршае ўвесь працэс — ён акуратна абгладжвае капец, раўняе яго з усіх бакоў, і той становіцца, па заключэнні бабы Ганны, "як лялька".

Капец завяршае ўвесь бульбяны рытуал.

ЗА два тыдні сям'я ўпраўляецца з уборкай бульбы, і баба Ганна збіраецца дамоў. Маці Дарынкі ладзіць ёй у адну торбу абновы (новыя кофты, спадніцы, фартухі, якія яна нашыла яшчэ задоўга да прыезду маці), у другую складвае ладныя мяшэчкі з рознымі крупамі і белай мукой. Гэтыя прадукты, якія яшчэ ў сям'і называюцца незразумелым для малой словам «дэфіцыты», атрымлівае Дарынчын бацька па спецыяльных талонах у вагоне-краме.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Выходзячы з хаты, баба Ганна асяняе яе крыжам і штосьці шэпча. Бацька з маці, з Дарынкай за рукі, ведуць-праводзяць бабулю да цягніка. Калі той даедзе да месца, яе сустрэнуць дзядзька Ян са сваімі дзецьмі.

— Мам, а мам, а што бабуля шаптала, калі выходзіла з нашай хаты? — пытаецца Дарынка па дарозе дамоў. Як ні прыслухоўвалася яна, так і не расчула ніводнага слоўца старой, і гэта не дае ёй спакою.

— А яна прасіла Госпада, каб жа ў нашай хаце заўсёды была бульба і да яе ўсё. А яшчэ, каб вы слухаліся бацьку і маці, каб глядзелі адзін аднаго, каб у нашым хляве не пераводзілася жыўнасць, каб мы былі жывыя і здоровыя, каб...

Дарынка, трымаючыся за рукі бацькоў, весела падскоквае паміж імі і запамінае, што кажа маці. Аказваецца, на ўсё жыццё.

**Раіса ДЗЕЙКУН, г. Гомель.**

■ Людзі і лёсы

# НЕ ПЛЮЙ У КРЫНІЦУ

Прыгадваецца лёс адной жанчыны. Назаву яе Лідай. Адзіная дачушка ў бацькоў. Маці працавала даяркай, бацька — трактарыстам. Заробкі ў абаіх у 70-я гады былі неблагія. У хаце дастатак. Дачушка ні ў чым не мела адмовы, толькі вучыся і гуляй. І расла Ліда, не ведаючы турбот, не прывучаная да стараннай працы, у атмасферы частых сварак і калатні, бо маці магла часцяком падгуляць і вярнуцца дадому апоўначы. У часы ранішніх разборак Ліда не раз чула нараканні маці на няўдачнае замужжа. Бабуля, якая жыла побач, таксама рабіла свой «унёсак» у сямейныя справы. «Магла ж выйсці за начальніка, дык не, выбрала мазутніка-трактарыста. Ты, унучачка, глядзі, не зрабі такога. Падбірай чалавека з пасадай і дастаткам. А цяпер вучыся гуляць-танцаваць, працаваць жыццё навучыцца». Прывабная знешне і без браку розуму, Ліда яшчэ школьніцай палажыла вока на суседа Анатоля, які ўжо адслужыў у войску і працаваў у раёне шафёрам.

Без вялікіх намаганняў скончана школа, Ліда — студэнтка педінстытута. Праўда, праз пагрозу адлічэння за «прыкладныя» паводзіны вымушана была пасля трэцяга курса перавесціся на завочнае аддзяленне. І ўсё ж праз два гады з дыпломам на руках прынята на работу ў аддаленую школу. Сувязі з Анатолем не губляла, а ён, шчыра закахаўшыся, рэгулярна прыязджаў на спатканні. Справа блізілася да афармлення шлюбу. Жаніх купіў шлюбны вэлюм, сукенку і туфлі на высокім абцасе, белыя. У вызначаны час прымчаў на кватэру Ліды, а там... застолле грыміць!

Напярэдадні Ліда, прыпомніўшы павучанні бабуліваражбіткі і лёс маці, завітала да маладога, яшчэ халасцяка, старшыні калгаса, які, дарэчы, удзяляў увагу сімпатычнай настаўніцы, і ўльтыматыўна запатрабавала рэгістрацыі шлюбу тэрмінова, а то будзе позна. Што было тут жа афармлена ў сельсавеце. І цяпер гулялі ці то заручыны, ці то вяселле.

Анатоль аслупянеў. А даведаўшыся, у чым справа, на вачах нешматлікіх гасцей разарваў на кавалкі шлюбны строй, а туфлі шпурнуў на стол з закускамі і са сваім сватам іргануў з хаты.

Здавалася б, што на гэтым гісторыя нядалага кахання Анатоля скончылася, ды Ліда не пакінула яго ў спакоі. Напэўна, і яе сэрца шчымела ад даўняй закаханасці. Яна патэлефанавала раз, другі, шкадуючы аб неабдуманым, паспешлівым учынку, тлумачачы сваю памылку, бо муж быў ёй не даспадобы: сур'ёзны, вечна заняты па працы.

У Анатоля ў грудзях кіпела і злосць, і крыўда, і боль, і пяшчота, і ён згадзіўся на сустрэчу. Ліда прыехала адведаць бацькоў, і спатканне адбылося, даўнія кантакты аднавіліся. Ды ад людзей на вёсцы не схавацца... Адна надта актыўная суседка, якая ведала ўсё і пра ўсіх, вырашыла выкрыць тайну. Аднойчы ноччу разбудзіла старшыню і паведаміла, што, напэўна, зладзеі гаспадараць у яго гаражы. Старшыня рвануў дзверы гаража, уключыў святло і здранцвеў ад убачанага. Схапіўшы манціроўку, скочыў да машыны. Ды «зладзеі», падхапіўшы адзенне, растварыліся ў начной цемры. З роспачы мужчына ўбег у кватэру, схапіў бутэльку і з рыльца, чаго не рабіў ніколі, выпіў амаль усю. Чалавек, які ніколі не садзіўся за руль, выпіўшы чарку, у такім стане не мог не ўчыніць аварыі і аказаўся ў рэанімацыі.

**Жаніх купіў шлюбны вэлюм, сукенку і туфлі на высокім абцасе, белыя. У вызначаны час прымчаў на кватэру Ліды, а там... застолле грыміць!**

Ліда, як таленавітая артыстка драмы, раскаялася ў парушэнні сужэнскай вернасці. Дабілася даравання і вяртання мужа і бацькі (ужо мелі гадавалага сыночка) у сям'ю. Змянілі месца жыхарства і працу.

Ды чалавек, паспытаўшы забароненага плода, не можа спыніцца і шукае новых прыгод. Так і Ліда. Для кар'ернага росту наладзіла цесныя стасункі з раённым начальнікам і дабілася пасады кіраўніка. Анатоль, даведаўшыся пра «кар'ерныя» сувязі каханай, адвярнуўся ўжо назаўсёды. І засталася жанчына з нялюбым мужам, які са сваім мяккім характарам, ды і не сказаць каб моцным здароўем пасля аварыі, дараваў ёй ці рабіў выгляд, што дараваў. Недарэмна мудрыя людзі казалі: «Не плюй у крыніцу — прыйдзеш па вадзіцу».

**Альфрэд ТЫЧКО,**
***в. Ідолта, Мёрскі раён.***